# ДЗІЦЯЧАЯ ЛІТАРАТУРНАЯ ТВОРЧАСЦЬ: МАТЫВЫ, ЗНАЧЫМАСЦЬ, АЦЭНКА

Па-сапраўднаму цікавым, карысным грамадству можа быць толькі чалавек-творца, які, гледзячы ў будучае, нястомна імкнецца змяніць свет да лепшага.

Тэхнізацыя і камп'ютэрызацыя, нізкапробная тэлепрадукцыя, сумніўнай якасці літаратура – фактары, што не спрыяюць станаўленню творчай асобы вучня. На першае месца ўсё часцей вылучаецца пераймание, імітацыя, дзеянне па алгарытму. Між тым калі вучань за доўгія гады ў школе не навучыўся сам нічога тварыць, то і ў дарослым жыцці ён заўсёды будзе толькі пераймаць і капіраваць.

У навуковай педагагічнай і метадычнай літаратуры існуюць розныя падыходы як да вызначэння творчых здольнасцей малодшых школьнікаў наогул, так і да характару дзіцячай літаратурнай творчасці, яе матываў і прызначэння.

Разгледзім найбольш цікавыя з іх.

Варты належнай увагі вопыт абуджэння дзіцячай літаратурнай творчасці апісвае Л.Талстой у вядомым артыкуле "Каму ў каго вучыцца пісаць – сялянскім дзецям у нас ці нам у сялянскіх дзяцей". Вялікі пісьменнік прыходзіць да парадаксальнай, на першы погляд, высновы: дарослым, і яму самому, трэба вучыцца ў сялянскіх дзяцей, а не наадварот, бо ў дзіцячай творчасці існуюць такія рысы, якія ўласцівы толькі гэтаму ўзросту, і кожнае дзіця адчувае жыццё глыбей і паўней за дарослага. У сваёй Яснапалянскай школе Л.Талстой многа зрабіў для фарміравання творчых літаратурных здольнасцей вучняў. У прыватнасці, ён часта ўжываў такі прыём: прапаноўваў дзецям тэму, прычым, не абавязкова прыдуманую спецыяльна для іх, пачынаў твор, а вучні падказвалі яму працяг. Як можна заўважыць, адмаўляючы ўсякае выхаванне, Л.Талстой займаўся не чым іншым, як самім літаратурным выхаваннем: ён заахвочваў дзяцей да творчасці, абуджаў іх пачуцці, прапаноўваў тэму, накіроўваў працэс, паказваў прыёмы…

Трэба сказаць, што ніхто, наколькі нам вядома, з класікаў рускай і савецкай дзіцячай літаратуры – ні К. Чукоўскі, ні А. Барто, ні С. Маршак – не адмаўляў дзіцячай таленавітасці ў раннім школьным узросце. Пра гэта не аднойчы гаварылі і пісалі Я. Брыль, В. Вітка, У. Юрэвіч, У. Ліпскі і іншыя пісьменнікі. Прывядзем тут аўтарытэтнае выказванне Я. Брыля: "Амаль усе дзеці – паэты. Ды, мусіць, і ўсе. У сваёй наіўнай любові да жыцця, у сваёй вясёлай славатворчасці [1, с. 188 ].

Грунтоўна даследавана праблема дзіцячай літаратурнай творчасці ў працах Л. Выгоцкага. Адным з матываў імкнення да мастацтва і да самавыражэння сябе з дапамогай сродкаў мастацтва вядомы псіхолаг лічыць тое, што арганізм чалавека ўспрымае многа больш знешніх раздражняльнікаў, чым ён можа змясціць. "Наша нервовая сістэма, – піша Л. Выгоцкі, – падобна на станцыю, да якой вядуць пяць шляхоў і ад якой адыходзіць толькі адзін… і то пасля жорсткай барацьбы, … чатыры

застаюцца на станцыі. Нервовая сістэма, такім чынам, напамінае пастаяннае поле барацьбы, а нашы рэальныя паводзіны ўсяго толькі маленькая частка таго… што не знайшло сабе выхаду” [2, с.313].

Погляды Л. Выгоцкага на праблему дзіцячай творчасці карэнным чынам адрозніваюцца ад поглядаў Л.Талстога. У кнізе “Уяўленне і творчасць у школьным узросце” псіхолаг сцвярджае, што ўласна літаратурная творчасць пачынаецца ў юнацкім узросце, прыходзячы на змену маляванню як віду дзейнасці, які дагэтуль забяспечваў самавыяўленне дзіцяці. На наш погляд, гэтае палажэнне вядомага псіхолага у рэаліях цяперашняга часу можна разглядаць як у некаторай ступені дыскусійнае. Безумоўна, дзіцяці падабаецца гуляць са словам і рыфмай. Але ў падобных гульнях цудоўным чынам спалучаюцца займальнасць і разуменне значымасці, сілы і прыгажосці слова. Дзеці не гуляюць, падобна некаторым дарослым, у паэтаў, яны вучацца здзіўляцца жывому слову.

Мы поўнасцю згодныя з псіхолагам Вадзімам Левіным, што “прадукты дзіцячай творчасці могуць набываць мастацкую каштоўнасць, могуць праўдзіва адлюстроўваць унутраны свет дзіцяці, але толькі да таго часу, пакуль гэтая творчасць мімавольная, гэта значыць самастойная, і зыходзіць з унутранай патрэбы выказацца” [3, с.43].

. Пытанне ў іншым: як стварыць самую патрэбу выказацца. Асобныя разрозненыя распрацоўкі айчынных метадыстаў пакуль не даюць здавальняючага адказу на гэтае няпростае пытанне. Іншымі словамі, стымулы да творчасці, матывы мастацкай творчасці яшчэ чакаюць сваіх даследчыкаў. В. Левін – яго думкі ў адносінах да фарміравання матываў мастацкай творчасці ўяўляюцца нам найбольш цікавымі – лічыць, што галоўнае тут “асаблівым чынам арганізаваная дарослым творчая дзейнасць у працэсе камунікацыі, якая з пункту погляду дзіцяці выглядае гульнёй”/3, с. 44/. На думку вучонага гэта могуць быць практыкаванні-гульні “Дапішы за аўтара два радкі”, “Што на што падобнае”, “Прыдумай пачатак” і інш. У названых гульнях-спаборніцтвах поўнасцю магчымы элементы ацэнкі і самаацэнкі. Па меншай меры такія прыкметы мастацкасці як нечаканасць, дакладнасць, арыгінальнасць дзеці заўважаюць даволі добра. Педагог павінен стварыць атмасферу спрыяльную настолькі, каб дзеці чакалі і жадалі тактоўнай ацэнкі дарослага і сваіх сяброў, радаваліся поспехам таварышаў а не пасмейваліся з іх няўдалых радкоў.

Дзіцячая творчасць, як і гульня, (па Выгоцкаму) патрэбна перш за ўсё самому дзіцяці для развіцця яго сілаў і задаткаў. Але гэтую формулу, думаецца, нельга лічыць універсальнай, бясспрэчнай. Мы запыталіся ў кожнага са студыйцаў малодшай групы Брэсцкага абласнога цэнтра дзіцячай і юнацкай творчасці: “Чаму ты ходзіш займацца ў танцавальную студыю?”. Дзеці назвалі наступныя прычыны:

- вельмі падабаецца танцаваць – 52%;
- так хоча мама – 5%;
- “калі мы танцуем, радуюцца ўсе людзі ў зале” –23%;
- “хачу стаць артысткай ” – 18%.

Як можна заўважыць, адзін з асноўных матываў творчасці ў дадзеным калектыве – прынесці задавальненне, эстэтычную радасць гледачу наогул, бо ў зале не толькі бацькі і настаўнікі.

Можна пачуць пярэчанне, што дарослыя атрымліваюць задавальненне і ад прымітыўнасці вершаў ці малюнкаў, і нават ад дэфектаў дыкцыі маленькіх чытальнікаў. Але тут ёсць нагода падумаць аб узроўні мастацкага ўспрыняцця самімі дарослымі, аб іх агульнай культуры. Адна справа пахваліць ўласнае дзіця (прычыніць задавальненне і сабе і яму) за няўмелы малюнак, і зусім іншае – адабраць лепшыя малюнкі з некалькіх сотняў, даступна і тактоўна растлумачыўшы пачынаючым мастакам вартасці і недахопы іх прац. Паступова, прытрымліваючыся пачуцця разумнай меры, педагог павінен арыентаваць юныя таленты на гледача, слухача, чытача. Чым больш матывы дзіцячай творчасці набываюць грамадскі характар, тым большае імкненне ў пачынаючых творцаў удасканальваць тэхніку, набліжацца да ўзроўню сталых майстроў.

Каб атрымаць эстэтычнае задавальнене, дарослыя, у тым ліку і знаўцы мастацтва, прысутнічаюць на выступленнях дзіцячых калектываў, кіруюць імі, дапамагаючы юным дараванням. Мы лічым, што дзіцячая творчасць аказвае ні з чым не параўнальнае ўздзеянне на чалавека любога ўзросту ўжо па той прычыне, што дзяцінства – абавязковы этап у жыцці кожнага чалавека. “Усе мы родам з дзяцінства”. У кожнага з нас да сталых гадоў захоўваецца памяць дзяцінства. І колькі таго, дзіцячага, – хто больш, хто ў меншай меры – мы нясем праз усё жыццё!

Высока цаніў літаратурныя здольнасці малодшых школьнікаў В. Сухамлінскі. “У дзяцінстве кожнае дзіця – паэт. Вядома, было б наіўным чакаць, што паэтычнае натхненне прыйдзе да дзіцяці само па сабе… Паэта ў душы абуджае чалавечае пачуццё цудоўнага… Даць дзіцяці радасць паэтычнага натхнення, абудзіць у яго сэрцы жывую крыніцу паэтычнай творчасці – гэта такая ж важная задача, як навучыць чытаць і рашаць задачы…. Паэтычная творчасць даступна кожнаму. Яна не з’яўляецца прывілеяй адораных” [4, с. 217].

Усё жыццё і творчая дзейнасць слыннага педагога – яскравае пацверджанне гэтых слоў.

“Кожнае дзіця – паэт”. Паспрабуем абгрунтаваць гэтую думку, якая часта паўтараецца даследчыкамі дзіцячай творчасці. Бясспрэчна перш за ўсё тое, што рэчаіснасць дзеці ўспрымаюць зусім не так, як дарослыя. На навакольны свет яны глядзяць шырока адкрытымі вачамі, не суадносячы ўспрынятае, убачанае, пачутае з практычнымі мэтамі. Дзіця, што любуецца квітнеючым садам, назірае за працай марудлівых паласатых чмялёў, не стане прыпамінаць, які ўраджай яблыкаў быў у мінулым годзе і які, мяркуючы па квецені і апыленні, чакаецца сёлета. У гэтым малое падобна да паэта. Уявім, тым больш, што дзіця бачыць сад, як і многае ў сваім жыцці, у першы раз. Ён, гэты сад, для дзіцяці – непазнаны свет. Малое расце, не перастаючы здзіўляцца. Як даказана сучаснымі псіхолагамі (В. Нікіфарава, А. Лявонцьеў і інш.), дзеці дрэнна адаптуюцца і да паўторных уражанняў. Нават

многаразовыя ўспрыманні не перашкаджаюць прадмету быць цікавым. Урэшце, дзецям не ўласціва выбарнасць у пазнанні свету, ім цікава ўсё, што навокал. Само слова, дзеці таксама ўспрымаюць вобразна, уяўляючы за кожным канкрэтны жывы вобраз, і нават гукавая абалонка слова выклікае асацыяцыі, пэўныя эстэтычныя рэакцыі.

К.Чукоўскі ў кнізе "Ад двух да пяці" прыводзіць вялікую колькасць прыкладаў абвостранай цікавасці дзяцей да гучання і рытмікі слоў. Пачуўшы выразнае незвычайнае слова, дзеці могуць з задавальненнем скандзіраваць яго некалькі дзён. Яны ахвотна запамінаюць незразумелыя даросламу лічылкі. Нават калі моўная адзінка ўзбагачаецца іншымі вобразамі прадметаў, абагульняе значэнні, становіцца паняццем, дзіця яшчэ доўга знаходзіцца ў палоне яе першаснага вобразнага зместу.

Каб навучыць дзіця заўважаць вобразны лад мовы, неабходна пастаянна звяртаць увагу на эмацыянальна-выяўленчую ёмістасць мастацкага слова, яго эстэтычную прывабнасць і выразнасць. Пачынаць такую працу трэба ў раннім школьным і нават дашкольным узросце, пакуль у дзяцей не згублена непасрэднасць успрыняцця першапачатковай эмацыянальнай вобразнасці мовы і цікавасць да яе, пакуль дзіця пазнае і здзіўляецца. Гэта добра разумелі класікі рускай і савецкай педагогікі. М. Рыбнікава нездарма назвала свой праграмны артыкул "Ад маленькага пісьменніка да вялікага чытача". Таленавіты метадыст, яна разумела, што літаратарамі стануць адзінкі, але дзесяткі і сотні стануць больш пісьменнымі, палюбяць мову і мастацкае слова. Непасрэднае судакрананне з самім творчым працэсам, адчуванне яго зблізу, знутры, дае куды больш плённыя вынікі, чым праца па вывучэнні мастацкіх асаблівасцей твора.

Для таго, каб уступіць у дыялог з пісьменнікам, як найбольш поўна зразумець яго, юнаму чытачу неабходна самому пабыць аўтарам, апусціцца ў стыхію літаратурнай творчасці. Так, "знутры", ён лепш зразумее, якія задачы ставіць перад сабою пісьменнік, якія цяжкасці пераадольвае. Далучэнне да творчасці не можа ісці інакш, як па шляху самастойных практыкаванняў.

Праблема дзіцячай літаратурнай творчасці не была абыдзена ўвагай і айчынных метадыстаў. У свой час шырокая дыскусія ішла вакол грунтоўнага артыкула акадэміка М. Лазарука "Навучанне літаратуры як творчасць," змешчаным у кастрычніцкім нумары часопісе "Полымя" за 1983 год, дзе вядомы беларускі вучоны-літаратуразнаўца пераканаўча даказаў неабходнасць таго, каб творчы элемент ляжаў у аснове навучання літаратуры ў сённешняй школе. У названым артыкуле (у 1994 годзе выйшаў у зборніку літаратурна-крытычных прац) вывучоны аргументавана даказвае, што формы працы з вучнямі-пачаткоўцамі на ўроках літаратурнага чытанння "павінны быць актыўнымі, можа нават асабліва актыўнымі, такімі, што грунтуюцца на навучанні-творчасці" [6, с.43].

Такім чынам настаўнік павінен спалучаць два накірункі педагагічнага ўздзеяння: а) далучэнне дзяцей да мастацкага слова праз чытанне; б) разуменне твора праз уласную творчую практыку дзяцей. Паслядоўнасць гэтай працы бачыцца наступнай: ад працы з класам, пошуку таленавітасці

кожнага вучня, да мэтанакіраванай падтрымкі дзяцей, здольных асабліва выразна разумець і адчуваць слова, вобразна ўспрымаць навакольны свет.

Дарослы павінен выступаць сааўтарам маленькага творцы. Без кіраўніцтва вопытнага педагога, уражлівага да мастацкага слова, творчы акт у дзяцей, як паказалі нашы назіранні, часцей за ўсё характарызуецца цэласнасцю – малодшыя школьнікі заканчваюць працу ў адзін прыём, вобразы не складаюцца імі з асобных частак – і міжвольнасцю. Вельмі цяжка таксама падабраць аргументы, каб пераканаць дзяцей у патрэбе праўкі і рэдагавання.

Як сведчаць нашы назіранні, творчыя здольнасці дзяцей фарміруюцца толькі пры мэтанакіраваным, сістэматычным кіраўніцтве пад уздзеяннем мастацкага слова на выяўленне дзіцячай індывідуальнасці. Педагогу трэба дапамагчы дзецям палюбіць думаць, разважаць, дапамагчы парадавацца нават самаму маленькаму, але свайму ўласнаму адкрыццю. У насалодзе думкаю велізарныя магчымасці для абуджэння і фарміравання творчых здольнасцей дзяцей.

Дзіцячая творчасць не самамэта. У школах не павінна ставіцца задача падрыхтоўкі пісьменнікаў. Мы рыхтуем прафесійных чытачоў. У класах, дзе настаўнік беражліва вырошчвае “творчасці зярняты залатыя” (В.Туркевіч), дзеці свядома ўспрымаюць рытм і рыфму, лягчэй і паўней разумеюць вобразнае значэнне слова і мастацкай дэталі, міжволі параўноўваюць паэтычныя шэдэўры са сваімі вершаванымі вопытамі.

Разгледзім некаторыя асаблівасці паэтычнай творчасці малодшых школьнікаў, заклікаўшы ў падтрымку ўласны вопыт кіраўніцтва літаратурным гуртком.

Мы не выдзяляем у дзіцячай творчасці выразна акрэсленых этапаў. Зразумела адно: у сваім развіцці дзіця ідзе ад гульні са словам да разумення ролі гэтага слова ў мастацкім кантэксце, да імкнення з дапамогай мастацкага слова выказаць свае ўласныя пачуцці, толькі свой уласны погляд на свет. На працягу гэтага шляху фарміруецца ўменне заўважыць і ацаніць поспех ці няўдачу сябра, ўласныя паэтычныя знаходкі і пралікі.

Галоўная крыніца дзіцячай творчасці – новыя жыццёвыя ўражанні. Аднак мастацтва не можа ўзнікнуць там, дзе ёсць толькі жывое пачуццё. Само па сабе пачуццё можа перагарэць, так ніякім чынам і не ўвасобіўшыся ў творчай працы. “Патрэбен творчы акт пераадольвання пачуцця… перамогі над ім… толькі тады з’яўляецца мастацтва” [2, с. 315]. Пераадолеўшы гэтыя цяжкасці, дзіця адчувае задавальненне, яго радуе дасягнуты поспех, акрыляе тое, што іншыя таксама адчулі радасць ад ягонага слова.

Калі мы можам весці гаворку пра калектыўныя пісьмы, сачыненні ці нататкі, то такое паняцце як “калектыўны верш” па многім прычынам трэба адкінуць: нівеліруюцца творчыя магчымасці вучняў, не праяўляецца індывідуальнасць успрыняцця; у дзяцей складаецца перакананне, што пісаць вершы – лёгка і проста. Сапраўдная паэзія – справа індывідуальная, нават, можна сказаць, інтымная.

Каб папярэдзіць імітацыю, штампы і дэкларатыўнае пустаслоўе, трэба паставіць перад дзецьмі адну ўмову: пішам толькі пра тое, што бачылі, чым захапляліся, у чым прымалі ўдзел.

Вершы не групуюцца па сезонна-тэматычнаму прынцыпу, не пішуцца на зададзеную тэму, але ўсё ж з пэўнай доляй умоўнасці можна вызначыць кола дзіцячай зацікаўленасці. (Ніжэй прыводзяцца вершы і ўрыўкі з вершаў вучняў 1–4-га класаў сярэдняй школы № 30 г. Брэста, выхаванцаў паэтычнага гуртка "Першацвет".

Вучні, якія да школы выхоўваліся ў вёсцы, пішуць часцей за ўсё аб прыродзе.

*Восень-гарэза*

*Палі і лугі прыбрала,*
*Копы ў стагі паскідала,*
*Рэчку прымарозіла,*
*Рыбак замарозіла,*
*Лісця намяла,*
*А сама ўцякла. (Лена К. 4кл.)*

*Ручаёк*

*Першы ручаёк бяжыць,*
*Першы ручаёк звініць.*
*З першым ручайком вас. (Наташа Ш.)*

Юныя творцы не могуць не фантазіраваць: яны так бачаць, адчуваюць, вераць у тое, пра што пішуць.

*Жарабятка*

*Уначы на месячыку*
*Каталася жарабятка,*
*Распусціўшы грыву.*
*Зрабілася холадна,*
*І папрасілася малое:*
*– Здыміце мяне,*
*Пакладзіце ў ложак.*
*Хоць крыху сагрэюся, можа. (Алеся Н. 4кл.)*

Дзіцячыя вершы "добрыя". Не памятаецца, каб дзеці пісалі пра цёмнае, пачварнае.

*Сабачка*

*Рыжанькі, калматы,*
*Смешненькі такі.*
*– Падыдзі, не бойся,*
*Да маёй рукі.*
*Прынясу прысмакаў,*
*Малака папіць…*

*Да мяне прывыкнеш,*
*Будзеш з намі жыць. (Яноўская А.)*

Пачынаючыя паэты тонка адчуваюць гумар. Хочацца па-добраму ўсміхнуцца, чытаючы верш другакласніцы Ані П.

*Заняты чалавек*

*Адпачынку – ні мінуты:*
*Школа, музыка, камп'ютар,*
*Магазін, урокі, кошка,*
*Пагуляць хачу хоць трошкі…*
*І сама здзіўляюся,*
*Як з усім спраўляюся.*

Шчымлівае пачуццё не пакідае які час пасля знаёмства з вершам чацвертакласніцы Алесі Н., якую выхоўвае адна мама.

*Тата*

*Ноччу дождж ык ціха капаў,*
*Ноччу мне прысніўся тата.*
*Быў з калючай барадой,*
*Пахнуў дымам і смалой.*
*Ён прыедзе, ён раскажа,*
*Дзе хадзіў, як жыў без нас.*
*А пасля мяшок развяжа,*
*Што з дарогі той прыпас.*

Запамінаюцца і асобныя метафары-“адкрыцці” з дзіцячых вершаў апошняга часу: буракі ў спёку апусцілі вушы; восень адправіла птушак на поўдзень; сонечныя зайчыкі скачуць па галінках з рыжымі вавёркамі…

Дзеці спяшаюцца. Такая асаблівасць іх псіхікі. Няма падстаў стрымліваць дзяцей, іх трэба разумна папраўляць, даходліва пераконваць, што над закончанай “кульганожкай” ( дзіцячым вершам) неабходна яшчэ папрацаваць.

У кожнага з “паэтаў” мы цікавіліся, чаму ён хоча займацца ў літаратурным гуртку. Адказы дзеці давалі розныя: падабаецца знаходзіць патрэбнае слова, падбіраць рыфму, выбіраць памер; хочацца быць падобным да вядомых паэтаў і інш. Такія і падобныя адказы ні ў якім разе не павінны расчараваць педагога: вучні думаюць і шукаюць.

Ствараючы на аснове рэальнай рэчаіснасці сваю ўласную, уяўную, дзіця перажывае асаблівы, невыказны душэўны стан творчага ўздыму, захаплення, зразумелага толькі творцу. Па гэтай прычыне творчы працэс, можа здацца, мае сэнс і без мэты. У некаторай ступені гэта так. Творца набывае асабістае духоўнае багацце, што само па сабе вельмі важна. І ўсё ж яму, творцу, неабходны выхад у свет рэальны. Толькі ў гэтым свеце

створанае мастаком выканае сваю звышзадачу, судакрануўшыся з духоўным светам іншых людзей.

Якія ж бачацца магчымасці выхаду дзіцячых твораў "на людзі"?

Гэта могуць быць выступленні перад бацькамі на ранішніках, насценны друк, школьная радыёгазета, дзіцячыя перыядычныя выданні…

Адна з такіх форм – рукапісны часопіс. Паэты, апавядальнікі, пачынаючыя гісторыкі і даследчыкі фальклору змесцяць тут свае творы. Мастакі-ілюстратары зробяць малюнкі. Настаўніку застанецца толькі ажыццявіць агульнае кіраўніцтва. Дзіцячы часопіс набліжае літаратурную творчасць да жыцця, дае стымул да пошуку тэм, да пошуку слова.

Працуючы з асобнымі дзецьмі, не трэба забываць пра пошукі адоранасці кожнага з вучняў класа. У справядлівасці такога падыходу можна пераканацца, наведаўшы, напрыклад, Моладаўскую ці Перарубскую школы Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці. У апошняй з названых, базавай школе, усяго 26 вучняў. Большая палова з іх з'яўляюцца сябрамі паэтычнага тэатра "Крынічка", якім кіруе дырэктар, шчыры прыхільнік роднага слова. На свае творы дзеці з дапамогай настаўнікаў паставілі цікавую паэтычную кампазіцыю. Казкі і вершы вучняў гэтай невялічкай палескай школы, надрукаваныя ў дзіцячых перыядычных выданнях, займаюць каля трох альбомаў. У літаратурным музеі захоўваецца таксама вялікая колькасць грамат і падзяк вучням, пераможцам літаратурных конкурсаў. Тут жа кнігі з аўтографамі М.Танка, У.Калесніка, У. Юрэвіча… Ганаровыя экспанаты – зборнік "Казкі дзяцей Беларусі" з творамі юных перарубцаў і кніга паэзіі выпускнікоў і вучняў Перарубскай школы, выдадзеная Брэсцкім абласным цэнтрам юнацкай і дзіцячай творчасці.

Яшчэ прыклад. У адным з нумароў газеты "Літаратура і мастацтва" (6-га верасня 2002–га года) Уладзімір Ліпскі, пісьменнік, кіраўнік Беларускага дзіцячага фонду, паведаміў чытачам аб незвычайным праекце "Горад тысячы пісьменнікаў", якім надзвычай зацікавіў жыхароў горада Феадосіі старшыня секцыі дзіцячай літаратуры Саюза пісьменнікаў Крыма Яўген Белавусаў. Яму ўдалося даказаць уладам, бацькам і настаўнікам, што ўсе дзеці – геніі. Іх трэба толькі прыахвоціць да кнігі, зацікавіць працай у літаратурных гуртках. Крэда Яўгена Белавусава да геніяльнасці простае: кніга – лепшая калыханка для дзіцяці. Яго будучае залежыць ад таго, якія кніжкі прачытаны ў дзяцінстве. "Пяць гадоў змагання, – піша далей У. Ліпскі, – далі свой плён. Сёння ў Цэнтральнай гарадской дзіцячай бібліятэцы Феадосіі ёсць кніжачка трэцякласніцы Бэлы Бабаян "Сумныя вочы"… З'явілася кніжачка Глеба Фомкіна "Чаму мора чорнае і бурлівае"… Першакласнікі 4-ай школы напісалі сваю калектыўную кнігу "Дружныя рабяты", а трэцякласнікі СШ № 10 кнігу "Краіна Выдумляндыя"… У горадзе пачала выходзіць газета "Горад тысячы пісьменнікаў", у якой друкуюцца творы юных талентаў, рэцэнзіі на іх дэбюты". Вельмі многа можа зрабіць усяго адзін, апантаны, зацікаўлены дзіцячай творчасцю дарослы чалавек.

Усё сказанае вышэй пацвярджае яшчэ раз вядомыя словы В. Сухамлінскага, што літаратурная творчасць – не справа абраных.

Паэзія, творчасць – перш за ўсё, уменне бачыць незвычайнае ў будзённым і сказаць пра гэта па-свойму, кранаюча. Такі погляд на жыццё – аснова ўсякай творчай працы, у тым ліку і паэтычнай. Пры абазначаным падыходзе звычайнае, бачанае многа разоў, набывае новы сэнс, новае паэтычнае гучанне. Чалавек з “лянівымі” вачыма ніколі не зможа стаць ні паэтам, ні сапраўдным чытачом, які разумее хараство паэтычнага слова. Старэйшы сябар і дарадчык, настаўнік павінен вучыць сваіх гадаванцаў як “чытаць” свет, так і ўмець расказаць пра яго... Ветраным днём жніўня дзіця ўглядаецца ў толькі што пакінутыя ластаўчыны гнёзды – і нараджаюцца выдатныя радкі (прагучалі ў пачатку 70-ых гадоў у радыёклубе “Жывое слова”):

*Гнёзды ластавак, як рукавічкі,*
*Студзіць вецер пад шэрай страхой.*

Як не здзівіцца адчуванню слова, яго ёмістасці і незаменнасці ў прыведзеных радках!.. Мастацкі вобраз, заснаваны на ўдалым параўнанні, уяўляецца выразным, пачуццёва-запамінальным.

Творчае ўяўленне не з’яўляецца прывілеяй нямногіх адораных. Ім надзелены ўсе. Як ужо даўно заўважыў Гётэ, дзеці з усяго могуць зрабіць усё. Кожны чалавек ад моманту свайго нараджэння мае творчыя задаткі. Далей магчымы два вырыянты. Першы: калі бацькі і настаўнікі не будуць праводзіць працу па развіцці дзіцяці – яго творчыя задаткі застануцца нерэалізаванымі. Другі: калі здольнасці дзяцей будуць своечасова заўважаны і бацькі з настаўнікамі створаць неабходныя ўмовы для іх развіцця, тады гэтая асоба з часам можа сябе рэалізаваць як творца…

Які ж сэнс дзіцячай літаратурнай творчасці, бо зразумела, што далёка не кожны юны талент знойдзе сабе месца ў вялікай літаратуры?

Па-першае, літаратурная творчасць паглыбляе і пашырае спасціжэнне свету, напаўняе эмоцыямі жыццё, узбагачае пачуцці дзяцей.

Па-другое, яна дапамагае авалодаць такім багаццем, як нацыянальная мова – гэтым найдасканалым інструментам фарміравання і перадачы чалавечай думкі, пачуцця, унутранага свету.

Па-трэцяе, дзіцячая літаратурная творчасць дапамагае рыхтаваць чытача, фарміраваць яго чытацкія ўменні. Яна – адна з абавязковых умоў падрыхтоўкі чытача-сатворцы, суразмоўцы пісьменніка, здольнага паўнавартасна зразумець і асэнсаваць твор мастацтва.

Літаратура

1. Брыль Я. Збор твораў: У 4-ох т. – Мн.: Мастацкая літаратура, 1968. – Т.4. – С.3 – 188.

2. Выготский Л.С. Психология искусства. – М.: Искусство, 1968.– С.313.

3. Левин В. Д. Воспитание творчества. – Томск: «Пеленг», 1992. – 56 с.

4. Сухомлинский В.А. Сердце отдаю детям.– Мн.: Народная асвета,1982.–288 с.

5.Лазарук М. А. Навучанне і выхаванне творчасцю: Педагагічныя роздумы і пошукі. – Мн.: Народная асвета, 1994. – 200 с.